Самапомач

Samapomač

Беларуская кооперацыйна-гаспадарчая часопісь

Год II. | Вільня, Люты 1933 г. | № 2(5)


Хай злыдні над намі,
скрыночуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць с лы,
да самай магілы
Ары, барануй
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапамаччу

Джорджж РЭССЭЛЬ.
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 2 (5)

BIEŁARUSKAJA ABECEDA

Беларуская абэцэда.

A, a — A, a.	H, h — Г, г.	Ł ł, — Л, л.	S, š — Ш, ш.
B, b — Б, б.	Ch, ch — X, x.	M, m — M, м.	T, t — T, т.
C, c — Ц, ц.	I, i — I, i.	N, n — H, н.	U, u — У у.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	J, j — Й, й	Ń, ń — НЬ, нь.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
Č, č — Ч, ч.	Ja, ja — Я, я.	O, o — O, o.	V, v — B, в.
D, d, — Д, д.	Je, je — Е, е.	P, p — П, п.	У, у — Ы, ы
E, e — Э, э.	Ju, ju — Ю, ю.	R, r — P, p.	Z, z — З, з.
F, f — Ф, ф.	K, k — K, к.	S, s — C, c	Ž, ž — Ж, ж.
G, g — Г, г.	L, l — ЛЬ, ль.	Ś, ś — СЬ, сь.	Ź ź — ЗЬ, зь.

UVAHA: Pry niedaručeńni vypisanaj hazety z pošty treba zaraz-ža žadać vyjašnieńnia na tej ža pošcie. I tolki ŭ razie, kali b heta nie pamahło, treba zaraz-ža ab usioj spravie napisać u administracyju „Samapomačy". Padać pry hetym treba: kali (dakładna padać datu), čamu na jakoj pošcie i jakoha numaru časopisi nia možna było atrymać. Biaz hetycch danych zamienny numar „Samapomačy" vysyłacca nia budzie.

Administracyja „Samapomačy".

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŪNA - HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

| Hod II. | Vilnia, Luty 1933 h. | Nr. 2 (5) |

NAM PATREBNA ŠKOŁA PRACY.

Kali zabirajem tut hołas u spravie „škoły“, dyk majem naŭviecie nia hetulki skołu, jak ustanovu systematyčnaha navučańnia, kolki kirunak i systemu publična-hramadzkaj dumki ab uzhadavańni čałavieka da tych ci inšych zadańniaŭ. Heta apošniaje važna dla nas-kooperataraŭ asabliva, bo-ž i siła kooperacyi nia ŭ čym inšym, jak u adpaviedna pryhatavanych, naležna ŭzhadavanych ludziach.

Lišnim-by było ŭspaminać tut, jak kryŭdna adbivajecca na našym narodzie viekavoje panavańnie raz tej, druhi raz inšaj, ale zaŭsiady čužoj škoły i kultury. Heta škoła ŭ istocie svajoj apirajecca na klasyčnym pahladzie na pracu, jak na niešta naležnaje dla niavolnikaŭ, ale niaprystojnaje dla ludziej „aśviačonych“, abo dla ludziej z hetak zvanaj „vyšejšaj sfery“. Hety pohlad na pracu pachodzić z starapahanskich Hrecyi i Rymu, hdzie praca sapraŭdy pryznačałasia niavolnikam, a „śmiatanka“ masava „zajmałasia“ poezijaj, vajnoj, a najčaściej—pustoj hutarkaj, nieakiełzanymi hulniami i zvyčajnymi razbojami.

Ale dla nas, bielarusaŭ pad Polščaj, trahedyja ŭzhadavańnia na hetym nia kończycca; dla nas škoła jość čužoj nia tolki pavodle źmiestu, ale i pavodle formy. U nas škoła ad samaha pačatku i až da samaha vierchu jość niečym adarvanym ad sapraŭdnaha žyćcia, ad jahonych patrebaŭ, a lektura školnaja (čytańnie knižak) nie daje prykładaŭ da naśladavańnia Kołasaŭskich idealistaŭ-zmaharoŭ, ani Kupałaŭskich prarokaŭ, što vyraśli z našaj ziamli i dla jaje pracujuć. I dziela taho z siańniašnich škoł masava viartajucca ludzi nia tolki niazdolnyja nadać puls narodnamu žyćciu, ale časta niamohučyja navat hety puls uchapić. Heta ŭžo sapraŭdnaje kalectva! Prykładaŭ na heta poŭna ŭsiudy, a i naša redakcyja anahdaj atrymała apisańnie adnaje samatuham arhanizavanaje haspadarčaje biełaruskaje placoŭki, katoruju adnak nia ŭzdoleŭ paviaści dalej u škole vyhadavany intelihient. Jakim žacham pranizyvajuć kancavyja słovy hetaha apisańnia, kali aŭtor jahony, biełaruski haspadar, aŭtorytatyŭna zajaŭlaje, što *„bułtajskaja zdemoralizavanaja intelihiencyja nia moža pracavać“*. Jaki strašny prysud!—A što-ž havaryć ab maładych „reformatarach“, što sami nie patrapiŭšy jšče załažyć palec za palec, uvažajuć siabie za ŭpoŭnamočanych da „krytyki“ „dahetulašnich pavadyroŭ“?

Abo čaho varta siańniašniaja škoła, kali jana nia zdolna ŭzhadavać u čałavieku zrazumieńnia i entuzijazmu dla pracy i adkaznaści za jaje?—Škoła, zamiest hetaha, nadzialaje svaich haduncoŭ niaščasnymi pryvyčkami da ŭsich miaščanskich „vyhodaŭ“, „zdabytkaŭ cyvilizacyi“ i ŭsiakaha inšaha marnatraŭstva, a pa za školaj na hetu-ž moładź ad starejšaha pakaleńnia ŭ niažličanych vypadkach vieje ŭsiomaroziačym niezasłužanym „hieneralstvam“, abo hnillom razkładnoha fatalizmu i nihilizmu. — Ci-ž usio heta mahło kaho pryhatavać, zapalić da tvorčaj pracy naahuł, a tymbolš — da pracy hramadzkaj? — Nie! Siam-tam ža spatykanyja „dzielcy“ na ŭłasnuju ruku, heta nie nadzieja naša, a niaščaście!

Dyk dzie-ž vychad, dzie siła, što patrapiła-b zgalvanizavać, uspružyć i pchnuć naša žyćcio na peŭny tor haspadarčaje samabytnaści?

My ćvierdzili i ćvierdzim, što vychad znachodzicca ŭ kooperatyŭnaj samapomačy. Ale i kooperacyja nia jość ani cudam, ani niejkim „dobrym dziadźkam“: kooperacyja heta suma tolki zhodnaj, i ŭmiełaj pakiravanaj supolnaj ludzkoj pracy, da katoraj zdolny čałaviek, jaki zrazumieŭ, što pamahajučy bližniamu, sabie samomu pamahaje. — Apráča karyściaŭ materyjalnych, kooperacyja vučyć ludziej hramadzkaści, uśviedamlaje ab niebiaśpiecy vyzysku, budzić ducha buntu proci zła i niespraviadlivaści, navučajučy adnačasna pieramahać usie žyćciovyja trudnaści zhodnaj pracaj u hramadzie.

Kooperatyŭnaja samapomač jość najlepšaj, usiedastupnaj vypraŭkaj aficyjalnaj škoły i zapeŭnienym šlacham da spraviadliviejšaha ładu na śviecie: intelihiencyja znojdzie ŭ kooperacyi mahčymaść dapoŭnić i zastasavać svaje paznańni z škoły, šyrokija masy tut znojduć samuju školu, a ŭsie razam stvorać niepieramožny fundamant pad svoj usienarodny dabrabyt.

Dyk usie, chto dobraj myśli, u kooperacyju, bo jana jość sapraŭdnaj školaj pracy!

Prosim i papieradžajem našych Pavažanych padpiščykaŭ, čytačoŭ i prychilnikaŭ adnavić — chto jašče hetaha nie zrabiŭ — na dałučanym blankiecie konta P.K.O. № 180.485 padpisku na „Samapomač“ na biahučy 1933 hod.

Admin. čas. „Samapomač“.

Volnaja Trybuna.

Naša zadača.

Źmiaščajučy nižejpadanyja dumki, vyvady i prapazycyi adnaho z našych pavažanych čytačoŭ i znaŭcoŭ praktyčnaha kooperatyŭnaha žyćcia, nadajom im charaktar „Volnaj Trybuny“ ŭ nadziel, što znojducca ludzi, jakija dla dabra spravy zachočać pa mahčymaści najchutčej ab hetym-ža taksama vyskazacca. — Red.

„Kryzys“, nadta ciažka žyć, a žyć treba choć-by dziela taho, što śmierć naša (viedama—cialesnaja) nie papraviła-b losu našaha maładoha pakaleńnia, katoramu my, nia chto inšy, pavinny, kali nie stvaryć lepšaje budučyni, dyk prynamsia pakazać da jaje mahčyma najlepšuju i najkaraciejšuju darohu.

Kožnamu z nas viedama, jakaja biada ciśnie vyrobnika-ziemlaroba. U fabrykach dy kapalniach niama pracy na't dla stałych žycharoŭ, a što-ž kazać ab pryjezdnych?! Jak tak, dyk niama kudy jechać šukać pracy. Volej-niavolaj ci to miaščanin, ci to biezziamielny abo małaziamielny sielanin — zmušany siadzieć doma i ciarpieć. Ale nia možna siadzieć złažyŭšy ruki, bo chto nia jdzie ŭpierad, — toj astajecca, a astaŭšysia — raniej, ci paźniej hinie. Kudoj-ža jšci?

Ja ćviorda vieru i rašuča kažu, što najkaraciejšaj, a možna skazać i najlepšaj darohaj da haspadarčaha dabrabytu jość kooperacyja. Usie adzin druhomu pavinny dapamahać, nia hledziačy na toje, jakuju chto z nas maje palityčnuju šapku na hałavie, aby tolki mieŭ čystuju dušu, niesapsuty charaktar, aby byŭ praŭdzivym čałaviekam.

Kooperacyja jość darohaju da haspadarčaha dabrabytu najkaraciejšaj, adnak razam z tym i ciarnistaj, pa katoraj nia možna biehčy ŭ razsypku, ale treba pasuvacca hramadoju i ŭvažna. — Kooperatyŭnaje žyćcio ŭ praktycy nidzie jašče nie stvaryła adnej dla ŭsich navuki, adnaho sposabu kooperatyzacyi haspadarčaha žyćcia. Usiudy starajucca dapasavać kooperacyju da miascovych patrebaŭ. Treba i nam hetak sama šukać hetaha najlepšaha sposabu, katory moh-by zapeŭnić kooperatyvam pravidłovy razrost i daŭhaviečnaść, a pajščykam, kala ich zhurtavanym, mahčyma najbolšuju karyść materyjalnuju i moralnuju.

Koratka kažučy, kab załažyć kooperatyvu, skažam spažyvieckuju, ciapier mała: sabrać kolkisot załatovak pajoŭ, vybrać Upravu, Nahladnuju Radu, kupić tavar, choć by ŭlezšy adrazu ŭ doŭh, naniać pradaŭca, jaki časta zusiom nia maje padhatoŭki da hetaje pracy i „ŭsio ŭ paradku“. Hetkija kooperatyvy i dasiul časta paŭstajuć, choć mały pracent žyvie daŭžej jak 1—2 hady, a najčaściej, ulezšy ŭ doŭh i razdaŭšy tavar taksama na doŭh — valacca i razsypajucca ŭ jedki pył, jak dla sučasnych pajščykaŭ, tak i dla dalokich nastupnikaŭ. Hetkija i im padobnyja „kooperatyvy“ prynosiać nie karyść, a škodu.

Jak-ža tady pastupać? — Pieradusim my pavinny viedać: čaho my chočam, što my da asiahnieńnia našaj mety majem, a čaho nam niedachop i jak zdabyć toje, čaho niama?—Usio heta pamojmu vyhladaje hetak prosta što nia treba doŭha abjaśniać:

Я. Косаўскі.

(5)

Для бліжніх.

Драма ў 4-ох дзеях.

(*З украінскай на беларускую мову тлумачыла Г. Ш.*)

ДЗЕЯ III

(*Лес. Вялікія дрэвы. З боку сцэны зямлянка. Каля яе пілы і сякеры. Каля зямлянкі гарыць агонь, над агнём гаршчок. Каля агня сядзяць лясныя работнікі. Воддаль, на калодзе, сядзіць бледны, змучаны Аляксей*).

ЗЬЯВА І.

(*Дрывасекі іграюць у карты, Аляксей падпёрся рукою, думае*).

І. дрывасек: А вось-жа цяпер мая возьме! (*кідае карту і адсоўваецца ад ігры*)

II. дрывасек: А каб цябе! Што? надаела йграць?

І. дрывасек: А кіньце к чорту гэтыя карты! Васіль, ці ёсьць там яшчэ што ў пляшцы?

II. дрывасек: Э, дык ты да абеду ўсю і вылакчыш! А мы, што-ж?

І. дрывасек: Ну, дык пійце і вы! Навошта-ж яна створана? Усё роўна! Ці піў, ці ня піў, а ногі некалі здубеюць. Ці-ж ня так?

III. дрывасек: А ўжо-ж.

І. дрывасек: Бяздомнаму, абы сяньня добра, а пра заўтра й ня пытайся!..

II. дрывасек: Дык ідзі ўжо прынясі, а то гавора да нас прамову, а гарэлкі не дае.

І. дрывасек (*выносе з зямлянкі пляшку*): Ну, але вы гаварэце, што хочаце, а мне каб гэта была поўная. У ёй ёсьць і бацька, і маці, і дом, і кроўныя і мая жонка. (*Перахіляе і п'е*).

III. дрывасек (*вырывае ў яго з рук*): Ды ўжо досыць! Уп'ешся, дык і сякеры ня ўдзержыш у руках. (*П'юць па чарзе*).

II. дрывасек: Гэй, а ты там, Аляксей! Чаго ад нас уцёк? Хадзі, вып'ем! Ты нешта яе не далюбліваеш. (*Сядаюць да картаў*).

Аляксей (*нібы прачхнуўшыся*): Пійце на здароўе. Мне ня хочацца! Я й так, як п'яны. За вялікі мой сум, каб яго запіць... Я й сам хацеў-бы яго забыцца, заліць, але гарэлкай яго не зап'еш. Вы шчасьлівыя, бо ніхто вас не абязчэсьціў, не наліў атруты ў ваша

Čaho my chočam? — My chočam haspadarčaha dabrabytu; heta znača, zakładvajučy kooperatyvy: spažyvieckija, kredytovyja i vytvorčyja (masładzielni, piakarni, masarni, pasieki, tkalni, młyny i t. p.) chočam uniezaležnicca ad pryvatnaha kapitału, chočam baranicca ad usiakaha rodu pasrednikaŭ i ašukancaŭ i zamiest dapamahać im bahacieć, chočam tvaryć svaje varstaty pracy, sami sabie i svaim nastupnikam budavać lepšaje žyćcio ŭva ŭsich jaho halinach.

Što my majem, a čaho nam niedachop?

My majem prava da lepšaha žyćcia, patrebu jakoha adčuvajem nadta vostra. Majem šmat ludziej zdolnych i pracavitych. Jość šmat i tych, katoryja jduć za hetymi ludźmi, byccam za puciavodnymi zorkami, kab paśla zbližyŭšysia da ich zapalicca i inšych ad ciemry baranić.

Niedachop-ža nam adnej supolnaj darohi, choć časta adnej kirujemsia dumkaju. *Niedachop nam viery ŭ svaje siły* i ćviordaha pierakanańnia ŭ tym, što dabrabytu nam nichto nia stvoryć, što my jaho pavinny dabyvać sami.

Ale, jak kałaski ŭ poli, tak i kožnaja praŭdzivaja dumka raście, nabiraje mocy i daśpiavaje, kab dać kamu treba svaje plony. Dumka ab patrebie budavańnia lepšaha žyćcia ŭžo daśpiavaje. Abjavaj hetaha jość časopiś „Samapomač", jakaja byccam zoračka zabliščeła nad kooperatyŭnaju nivaju, kab aśviacić da jaje darohu ŭsim tym, u kaho heta dumka ŭžo daśpieła, abo daśpiavaje. Usich hetych ludziej treba ciapier tolki paviazać arhanizacyjna. Zaniacca hetym mahło-b sumyśla arhanizavanaje napr. T-va Kooperataraŭ, jakoje pavinno-b nasampierš padhatoŭku choć małoj na pačatak hramadki instruktaroŭ orhanizataraŭ, a taksama pradaŭcoŭ-knihavodaŭ.

Kali ŭžo najhałaŭniejšy čyńnik — ludzi — adzyvajucca na hołas „Samapomačy" i šybka kala jaje hurtujucca, vysuvajecca druhaja patreba — hrošy. Hrošy patrebny na zapačatkavańnie i adpaviednaje nastaŭleńnie pracy ad samoha pačatku. Ćviordy heta harech, praŭda, ale susiom nie bieznadziejny, a jak žyćcio pakazvaje — mahčymy da apanavańnia, kali za jaho družna ŭziacca: treba stvaryć h. zv. *kooperatyŭny žalezny kapitał.*

Dobra było-b, kab zarhanizavańniem i dapilnavańniem celaści hetaha kapitału, prynamsia pakul što, zaniałasia Redakcyja „Samapomačy" (peŭnie adčyniła-b adpaviednaje konto (rachunak) u banku, a sama viała-b kontavuju knižku zapisvajučy na konto płatnika kožnuju jaho ŭpłatu). Hrošy hetyja nia byli-b achviaraju, a ŭłasnaściu kožnaha płatnika, a hetym samym užytyja jakim-by nia było sposabam pavinny byli-b uznoŭ pamału varočacca ŭ bank, z nievialikim pracentam. Hetkim paradkam kapitał hety u sumie ahulnaj nikoli-b nia mienšaŭ, a tolki ros i ros: tak z hadavych składak, jak i z pracentaŭ, da peŭnaha času ci sumy (napr. da 10—12 hadoŭ, abo da sumy 10 miljonaŭ zł.).

Składka vynosiła b najmienš adnu załatoŭku ŭ hod (kab kožny moh zapłacić), a najbolšaja mahła-b być zaležnaj ad samych składčykaŭ (choć-by i kolki złotych što miesiac).

Kožny składčyk svaju składku, sabranuju hetkim paradkam, pa ŭpłyvie niejkaha času (napr. 12 hadoŭ), moh by całkom, ci ŭ peŭnych ratach atrymać z kooperatyŭnaha žalez-

---

сэрца. А мне, ох! Боль у грудзёх, а сэрца сталася каменям. Ня ведаю, ужо і лік згубіў, ад якога часу мая чэсьць патоптана, калі спынена мяне ў дарозе. Я ўжо забыўся... А я толькі добра хацеў і праўды... О, калі-б я мог забыцца свой боль...

II. дрывасек: Аляксей, кінь журбу. Кажаш, абдзерлі цябе з чэсьці. А ты плюнь на іх. Ня будзеш гэтак цэлымі днямі журыцца і біць кулаком у галаву. Людзі — не ваўкі, адразу не зьядуць, а па кавалачку грызуць. А ты плюнь на іх і выпі брат — палягчэе!

Аляксей: Не, дзякую. Ня буду. Не палягчэе мне ад гэтага. (*Памаўчаўшы, да сябе*): І што я каму благога зрабіў?... Абакралі коопэратыву, да маей хаты парабілі сьляды, а ключ знайшлі рана пад дзьвярмі крамы. Добра абдумалі людаеды, каб мяне зрабіць злодзеям. І хоць суд мяне звольніў, але ня звольніла насьмешка і пагарда цэлай вёскі: „Вось чаму ён жадаў так коопэратывы! Каб забраць людзкі грош і прапіць сьвятамі"... (*Праз хвілінку*): І як яны там наладзілі справу? Каб хаця не перасталі, а далей вялі працу Рыгор і Насьця! Бо шкада разпачатай працы. Няхай я ўжо прападу, зьняможаны, абсьмеяны, але каб хоць добрая справа не прапала.

Ох, як цяжка цярпець зьнявагу за тое, у чым я нявінны!... Ніхто да мяне сьледу ня знойдзе. Пайшоў я на дабравольную катаргу, бо ня мог сьцярпець наруганьня. О, Божа, дай мне сілу перанесьці ўсё гэта! Ты адзін маю нявіннасьць знаеш... А можа яшчэ Насьця і Рыгор. О, мае вы прыяцелі, калі-б вы бачылі мяне ў гэтых лахманох і як я зьмяніўся!... Жабраком зрабіла мяне людзкая злосьць. — Эх, эх, калі-б вярнуўся мой супакой, каб сном быў той час, што дзеліць мяне няшчаснага, ад ціхага шчасьця і народнай працы!... Каб хоць пачуць, што там робіцца! Ці й на хутары ўжо жоўтыя дрэвы, як вось тут дубы пажоўклі?... Ці сьпявае Насьця ў садзе над рэчкаю?... А можа ўжо замуж вышла? Забылася мяне, бо я „злодзей"? І як там маці з айчымам дае раду? Ці й далей п'яніца марнуе наша дабро? Цяжка бяз весткі ад сваіх, але йшчэ цяжэй было-б мне зносіць наруганьні ад знаёмых людзей.

II. дрывасек: Стойце, браткі, закіпеў гаршчок! Абедаць пара! (*Адстаўляе з вагня гаршчок*).

III. дрывасек: Няхай астыне!

naha kapitału, z nievialikim pracentam, nazad, abo trymać ich tam dalej užo jak svaje aščadnaści na knižcy.

Žbirańniem hetych składak zaniałasiab-b nia tolki Redakcyja „Samapomačy", abo na't jakaja asobnaja ŭstanova, ale kožny hramadzianin, katory maje dobruju volu i achvotu pamahčy budavać fundamant pad vialiki narodny budynak. Žbirać treba-b pačać ad 1-ha lutaha s. h.

Mahčyma, što nia kožnaha hety prajekt pierakanaje. Dy ja adnc kažu — nie adrazu Vilnia zbudavana. Ničoha nieskładvajučy, my ničoha i nia majem, a mnohija z nas i kavałka chleba nia majuć. A kab choć adna piataja častka biełarusaŭ pad Polščaj składała ŭ a d n o m i e j s c a tolki pa adnej załatoŭcy ŭ hod, dyk za hod źbirałasia-b bolš paŭmiljona załatovak, što dało-b mahčymaść što hod budavać varstaty pracy dla tych, chto jaje šukaje, padymajučy hetym samym rovień našaha haspadarčaha žyćcia.

Padstavaju kooperacyi jość aščadnaść i zhodnaja hramadzkaja praca ludziej. Lik składčykaŭ Kooperatyŭnaha Kapitału, padobna jak lik čytačoŭ časopisi „Samapomač" pakaža ŭ niedalokaj budučyni, jak šybka śpieje ŭ našym narodzie dumka ab haspadarčaj samaabaronie i samapomačy.

Ab dalšych patrebach, tak arhanizacyjnaha jak i haspadarčaha charaktaru pahavorym druhim razam.

Jan-Son.

Ci Vy namovili choć adnaho padpiščyka dla „Samapomačy"?

Praca ŭ niamieckich spaž. kooperatyvach. (3)

Kooperavańnie. Na 1 studzienia 1927 hodu z ahulnaj sumy 15,5 miljonaŭ damovych haspadarak u Niamieččynie— 3,2 miljony — h. zn. 20,7% było skooperovanych. Na raspaŭsiudžvańnie kooperatyŭnych idejaŭ u Niamieččynie źviartałasia asablivaja ŭvaha. U kožnaj značniejšaj kooperatyvie jość specyjalny pracaŭnik — sekretar, katory, pry dapamozie asobnaj hrupy — kooperatyŭnaha aktyvu — viadzie systematyčnuju prapahandu kooperatyŭnych idejaŭ siarod pajščykaŭ i zajmajecca viarboŭkaju (namaŭlańniem i zapisyvańniem) novych siabroŭ. „Usie novyja siabry pavinny być — havorycca ŭ instrukcyi Hamburskaha Sajuzu spažyvieckich tavarystvaŭ — pieravychavany na kooperataraŭ... Tolki kooperatyŭna-dumajučy pajščyk moža dziejać pakooperatyŭnamu i zrazumieć mahčymaści i patreby raźvićcia spažyvieckaj kooperacyi. Tolki kooperatyŭna vychavany pajščyk moža pamahčy vyrašyć što-dnia ŭzrastajučyja zadańni kooperacyi".

U ŭzhadavańni pajščykaŭ i viarboŭcy novych siabroŭ vialikuju rol adyhryvajuć siamiejnyja viečaryny, jakija systematyčna ładziacca kooperatyvami. Zvyčajna ab hetkaj viečarynie šyroka abviaščajecca siarod žycharstva, i kožny pajščyk maje prava zaprasić na jaje svaich znajomych, nienaležačych da kooperatyvy. Za ŭvachod treba płacić bolš-mienš kala 50 fenigaŭ. Pry hetym na ŭspamin ab viečarynie kožnamu dajecca ŭ padarak filižanka i miašečak

IV д р ы в а с е к (*стоя*): А я курыць так хачу, што й абедаць ня маю ахвоты. Каб так хто зьбегаў у карчму. Пакуль астыне абед, можна вярнуцца. Схадзі, Дзяніс! Пойдзеш?

I. д р ы в а с е к: Калі йсьці; то пайду. Дайце грошы! (*Выходзе*).

А л я к с е й: Пачакай, Дзяніс, ты бяжыш у карчму?

I. д р ы в а с е к: Ага!

А л я к с е й: Зрабі ласку, запытайся у Абрама, ці ня быў гэтымі днямі той падрадчык з чыгункі з майго места. Запытаешся?

I д р ы в а с е к: Ды ўжо-ж запытаю, калі так хочаш. (*Пайшоў*).

IV д р ы в а с е к (*прысядае да Аляксея*): А што, Аляксей, есьці хочацца?

А л я к с е й: Ня надта.—Але на доўга так не залягайце, бо пара брацца за калоды. У суботу скупая будзе палучка.

IV д р ы в а с е к: Э, хто-б гэтым журыўся! I так цэлага лесу не перарэжам. Ты чаму ўсё так сядзіш воддаль. А сяньня ты яшчэ сумнейшы. Чаго ты? Па хаце тужыш?

А л я к с е й: Дзядзька! Ды я-ж вам расказаваў сваё гора. Вы знаеце, што ня дзеля заробатнаў я сюды вабрыў.

IV д р ы в а с е к: Бо ты дурны! Я, быўшы табою, плюнуў бы на ўсё... Журыцца, што хто абакраў краму, а людзі на цябе паказваюць.. Няхай паказваюць, Шыла з мяшка вылезе. Дрэнная справа ніколі не затоіцца. А табе ня трэба было з арэшту йсьці сюды. Трэба было вярнуцца дамоў, а то яшчэ горш цябе падазраюць. Я так ніколі-б не зрабіў.

А л я к с е й: Ды вы добра кажаце. I я сам знаю, што дрэнна зрабіў. Ды мяне тады такая нуда агарнула, так абрыд сьвет, што я чуць пад цягнік ня кінуўся. Неяк я сябе перамог. Стаў за местам і думаю: куды мне йсьці? Ці варочацца ў вёску, ці йсьці, куды вочы панясуць, забыцца, што я вырас у гэтай вёсцы, што ў мяне радня, што я там пакінуў сваю маладасьць, сваё шчасьце?... Націсnуў я шапку на вочы і пайшоў у другую старану, якая завяла мяне аж сюды. Такі жаль і злосьць мяне тады ўзяла, што я ня чуў, ня ведаў, ці ехаў хто каля мяне, ці йшоў... I сам ня ведаю на каго жаліўся. Віноўнікаў майго гора не магу згадаць. I да гэтуль грызуць мяне штодня туга і жаль.

IV д р ы в а с е к: Ды пакінь, хлопча! Ты сам сябе забіваеш. На цябе ўжо страшна глядзець, гэтак састрашнеў. Далей праца-

z sałodkim piačyvom (sażadžonki). U zali, dzie adbyvajecca viečaryna, usie hošci siadajuć za stoł i im padajuć (usio za tyja-ž 50 fenigaŭ) kavu. Pry hetym čytajucca dakłady ab kooperacyi; jany vielmi karotkija i ciahnucca nia bolš 20÷25 minut. U paŭzach pamiž dakładami demanstrujucca kino-filmy. Zakančyvajecca viečaryna kancertam, arhanizavanym ułasnymi siłami kooperatyvy.

Sposaby raspaŭsiudžvańnia kooperatyŭnych idejaŭ u Niamieččynie nie ahraničvajucca vykłučna dakładami i viečarynkami. Razy dvatry ŭ hod naładžvajucca h. zv. tydni prapahandy, padčas katorych arhanizujucca vystaŭki tavaraŭ, katorymi handluje kooperatyva, kab haspadyni mahli navučycca paznavać falsyfikaty (padroblanyja tavary), robiacca abchody pa kvaterach, viadziecca ahitacyja (namaŭlańnie) i h. d. — Dla pašyreńnia kooperatyŭnych idejaŭ isnujuć asobnyja prapahandnyja kamisii, złožanyja z najbolš śviedamych siabroŭ kooperatyvy. Jany žbirajucca nia mienš adnaho razu ŭ miesiac na pasiedžańnie dzieła vysłuchańnia dakładaŭ jaje siabroŭ ab pracy i dla apracoŭki planaŭ prapahandy na budučyniu.

U Niamieččynie robicca ŭsio mahčymaje, kab usie siabry kooperatyvaŭ dobra viedali ab tym, što ŭ ichnaj kooperatyvie robicca. Usie pajščyki rehularna atrymlivajuć drukavanyja hadavyja spravazdačy, štomiesiac va ŭsich kooperatyvach publikujucca dadzienyja ab abarotach za apošni miesiac i h. d. — Usio heta, razam uziataje, uśviedamlaje ludziej, robić niemahčymymi nadužyćci, uzmacoŭvuje davier da kooperacyi i pašyraje jaje ŭpłyŭ siarod pracoŭnych masaŭ nasielnictva.

Kiraŭničyja vorhany. Kiraŭničymi vorhanami niamieckich kooperatyvaŭ źjaŭlajucca: ahulny schod upaŭnavažanych, Kooperatyŭnaja Rada, Nahladnaja Rada i Uprava. Upoŭnavažanyja vybirajucca ahulnym schodam *tych pajščykaŭ kooperatyvaŭ, katoryja poŭnaściu spłacili svaje pai, źjaŭlajucca siabrami kooperatyvy nia mienš jak 2 hady i hadavy nabor katorych nia nižej siaredniaha naboru ŭsich pajščykaŭ.* — Hetkim čynam na kiraŭničyja stanoviščy vybirajucca najbolš aktyŭnyja (dziejnyja) siabry kooperatyvy. Pry vybarach stasujecca prostaje i roŭnaje hałasavańnie, pry hetym śpiski kandydataŭ vystaŭlajucca palityčnymi partyjami. Kožnaja kooperatyva vybiraje 3-ch upaŭnavažanych na 3 hady. Schod upoŭnavažanych usich kooperatyvaŭ peŭnaha rajonu źjaŭlajecca viarchoŭnym kirujučym vorhanam usich hetych kooperatyvaŭ i kožnaha paasobku. Adnak biezpasiaredna jon spravami nia kiruje: jaho naja rol ahraničvajecca zaćvierdžańniem i źmienaju statutu, kuplańniem i pradažaju niaruchomaści i h. d. Schod upaŭnavažanych zvyčajna nie vybiraje i biezpasiarednych kiraŭnikoŭ — upravy, a vybiraje tolki Nahladnuju Radu.

Abaviazkam kožnaha z upoŭnavažanych źjaŭlajecca pastajannaja viarboŭka (namaŭlańie) novych siabroŭ i kooperatyŭnaja ahitacyja. Nahladnaja Rada źjaŭlajecca pastajanna dziejučym vorhanam i składajecca z 10—12 siabroŭ. Štohod $^1/_3$ častka siabroŭ Rady mechanična vybyvaje i pieravybirajecca tym-ža schodam. Razam z upravaju Rada viadzie ŭsie biahučyja spravy, pryčym dla biahučaj pracy vydzialaje z siabie rad kamisijaŭ, miž inšym až 2 revi-

---

ваць ня зможаш. Што з табой будзе?... Адкідай ад сябе ўсе думкі пра тое, што сталася!

Аляксей: Ці-ж можна так адкінуць, забыцца?... Каб я знаў, праз каго я гэтак мучуся!...

IV дрывасек: Ды Бог з табой! Кажу табе, забудзься. У нядзелю пойдзеш са мной у вёску, да маёй хаты. Там разарвешся. Ня сумуй! Як ты ня вінаваты, дык нашто табе журыцца?

Аляксей: Я сам быў-бы рад — але цяжка! Дзякую, дзядзьку, што мяне адводзіце. Калі-б ня вы, дык я і тут ня выбыў-бы.

IV дрывасек: Выпі трохі гарэлкі, дык нічога думаць ня будзеш. Сапраўды папрабуй!

Аляксей: Ня піў я яе з малку і цяпер не хачу. І вам раджу ня піць: гэта атрута. Быдлё робіць з чалавека. (*Дрывасекі пачынаюць сьпяваць, IV-ты пайшоў да іх*).

А ў бары ў бары
Тры дарожанькі.
Гэй, гэй, гэй!
Тры дарожанькі.

Тудою ішлі
Тры салдацікі.
Гэй, гэй, гэй!...
Што к матачцы йдзе,
Песеньку пяе.
Гэй, гэй, гэй!...
Што к татачку йдзе,
Ў скрыпачку йграе.
Гэй, гэй, гэй!...
Што к мачысе йдзе,
Моцненька плача.
Гэй, гэй, гэй!
Моцненька плача.

(*Пад канец песьні ўвыходзе І-шы дрывасек*).

І дрывасек: Го, го! Аляксей! Знайшлі сьцежку да цябе! Вось, бачыш?... (*Дае пісьмо*)

Аляксей (*радасна кідаецца да яго*): Што?... Пісьмо?... Ды як?!...

І дрывасек: Той падрадчык, аб якім ты казаў спытацца, прывёз да Абрама. Казаў, што нейкая дзяўчына з твае вёскі, ці не твая гэта (*падміргівае*)— неяк ад яго даведалася, дзе ты, і вось перадала пісьмо...

Аляксей: Няўжо Насьця? Божа мой!..

(*Ідзе у старану і чытае*).

zyjnyja: — adnu dla kantrolu kramaŭ, a druhuju — dla faktyčnaj revizii spraŭ kooperatyvy i dla jejnaha bilansu.

Uprava, zvyčajna, nie vybirajecca, a *naznačajecca* Nahladnaju Radaju. Pavodle niamieckaha statutu siabry ŭpravy pryjmajucca da pracy biez ahraničeńnia sroku i ŭvažajucca jak zvyčajnyja najomnyja, kantraktovyja pracaŭniki. Zvyčajna siabroŭ upravy byvaje troch: adzin z ich ličycca staršynioj i źjaŭlajecca pradstaŭnikom kooperatyvy.

U niekatorych kooperatyvach zachavalisia jšče Kooperatyŭnyja Rady, katoryja hałoŭnym čynam, apracoŭvajuć plan kooperatyŭnaj prapahandy i kult.-praśvietnaj dziejalnaści. U bolšaści kooperatyvaŭ hetymi spravami zajmajeccca kooparatvŭny aktyŭ pad kiraŭnictvam sekretara.

(*d. b.*)

A. F.

Kooperatyŭnyja naviny.

— Los kooperacyi ŭ Polščy byŭ temaj naradaŭ Kooperatyŭnaj Rady dnia 17 studzienia ŭ Varšavie. Na hetaj naradzie pradstaŭniki ŭsich kooperatyŭnych Sajuzaŭ vyskazalisia praciŭ ahraničeńnia pravoŭ kooperacyi, jak heta pradbačyć uspaminany nami ŭ apošnim numary „Samapomačy" prajekt źmieny kooperatyŭnaha zakonu. Takim paradkam biezpasiarednaja niebiaśpieka dla kooperacyi na razie adsuniena. Dalšy los kooperacyi ŭ Polščy zaležyć budzie taksama ad družnaha vystupleńnia ŭsich kooperataraŭ u svajoj samaabaronie.

— Pamierli zasłužonyja pracaŭniki ŭ polskaj kooperacyi: 19.I.33 h. Br. Sivik — Staršynia Nahladnaj Rady Sajuzu Spažyvieckich Kooperatyvaŭ i 28.I.33 St. Sikorski — zastupnik dyrektara Centralnaj Kasy Ziemlarobskich Supółak. Viečnaja im pamiać!

Stan kooperacyi ŭ Čechasłavaččynie. Pavodle padličeńnia Centralnaha Sajuzu sielska-haspadarskich kooperatyvaŭ u Prazie na 1 studzienia 1932 h. (hod z lišnim tamu nazad) ličbovy stan kooperacyi ŭ Čechasłavaččynie pradstaŭlaŭsia hetak: 1. kooperatyvaŭ kredytovych — 7.508. 2 sielska-haspadarskich — 5.536, 3. spažyvieckich — 1.057. 4. vytvorčych — 1.581. 5. budaŭlanych (dla tannych pamieškańniaŭ) — 1.651. 6. roznych — 32, 7. kooperatyŭnych sajuzaŭ — 49; usiaho razam — 17.514. — Čechasłavaččyna, jak niezaležnaja dziaržava, narachŏvuje trynaccać z pałovaju mil. nasielnictva.

— Najbolšaj kooperatyvaj na śviecie jość „Londynskaje Kooperatyŭnaje T-va". Heta kooperatyva jašče ŭ 1925 h. mieła tolki 14.236 siabraŭ, a ŭ 1931 h. ich było ŭžo 429.421 (biaz-mała — paŭmiljonu). Ad 1928 h. hadavy pryrost siabroŭ kožny byŭ pa 28.000 čałaviek. U hetyja kooperatyvie pracuje 11.440 asob.

— Kooperatyŭny aeraplan „Daga" — Ark-an-Siel" jość ułasnaściaj francuskaj kooperacyi i adbyŭ pry kancy min. hodu padarož nad Atlantykam, łučačy hetak Francyju z paŭdzonnaj Amerykaj. Suśvietnaja kooperatyŭnaja presa adznačaje heta zdareńnie asablivaj uvahaj i praročyć jamu dalšy pamysny rozvitak. — Francuskaja kooperacyja ŭžo apanoŭvuje pavietra, a my tolki pačynajem vučycca chadzić vobmackam pa ziamli: z tym bolšaj zaŭziatašciu musim išci napierad.

— U Amerycy kooperacyja nia vielmi jšče pašyrana. Kooperatyŭnaja Liha Spaluč. Štataŭ Paŭnočnaj Ameryki abjednyvaje ŭsiaho tolki 458 kooperatyvaŭ z 185.000 siabrami. — I heta tady, jak małaja paraŭnaŭča Baŭharyja maje 3.505 kooperatyvaŭ z 700.096 siabrami.

Kali ŭžo mova ab kooperacyi baŭharskaj, dyk treba zamiecić, što baŭharskija kooperatary ŭzdabylisia na vielmi pamysłovy krok: jany ŭmovilisia abvieścić u siabie mes. listapad, jak mes. kooperacyi i ŭ hetym časie zajmajucca ŭsiakimi sposabami družnaha namaŭlańnia ludziej zapisyvacca ŭ isnujučyja kooperatyvy i tvaryć novyja. Zatym u ich i hetkija vyniki pracy.

— 25-yja ŭhodki Švedzkaj Lihi Kooperatystak prypadali na kaniec min. hodu i byli ŭračysta śviatkavany ŭsioj švedzkaj kooperacyjaj. Pieršy hurtok hetaj Lihi paŭstaŭ u Štokholmie ŭ 1906 h. Zasnavaŭ jaho mužčyna Marcin Sandel. jaki paznaŭ prad tym takuju ž Lihu Kooperatystak i jejnuju pomač dla kooperacyi ŭ Anhlii. Arhanizavanaja Liha švedzkich kooperatystak była

IV дрывасек: Ану, хлопцы, бярэцеся да працы. Я йшчэ люльку дакуру, а пасьля вас даганю. (*Усе сядаюць каля гаршка і ядуць*).

Аляксей (*прачытаўшы пісьмо*): О, Божа! Настачка! Зорачка мая! Ці-ж Тваё пісьмо верне мяне дамоў?... Выйшла мая нявіннасьць на верх? О, дзякуй-жа Табе, Божа, што скончылася мая мука!... Я вярнуся дамоў, у родную вёску... І чаму я не вярнуўся з арышту дамоў? — Ня мучыўся-б тут гэтулькі. (*Глядзіць на пісьмо, чытае*).

„Я знаю, што ты мучышся там душой і целам, ды мы з Рыгоркам ведалі, што ты нявінаваты. Мы на ўсе бакі кідаліся, каб знайсьці віноўніка, ды ўжо годзі". — О, добрыя, шчырыя прыяцелі!... „Варочайся зараз дамоў, як толькі дастанеш маё пісьмо, а калі не паверыш маім словам, то мы з Рыгоркам прыйдзем да цябе. Калі-б ня той падрадчык, што ў вашым лесе бывае, дык не даведаліся-б мы, дзе ты жывеш. Варочайся зараз, мой галубок, бо цяжка без цябе жыць! Ня менш ад цябе і я зазнала мукі... Колькі я па табе наплакалася, раскажа табе усё, як вернешся, наш садок. А дзядуля ўсё охкае і шкадуе цябе. А колькі было радасьці, як я даведалася дзе ты прабываеш. Цэлая вёска цябе шкадуе. А Зьмітручок Ґалаваты і твой айчым ужо сядзяць у турме. Здаецца, што іх там было болей. Твая мама таксама прыходзіла да нас, як даведалася, што ёсьць аб табе вестка. Гэтак плакала..."

IV дрывасек: Гэй, Аляксей! А ты што так зачытаўся ў пісьмо, што й есьці ня хочаш? Хадзі, бо ґрамада аднаго не чакае.

Аляксей (*вясёлы*): Ежце! Мне ўжо й есьці ня хочацца.

IV дрывасек (*падходзіць*): А што там? З дому дастаў пісьмо? Што пішуць?

Аляксей: Скончылася мая журба, дзядзька. Дараблю з вамі да суботы, вазьму грошы і разьвітаюся з вамі.

IV дрывасек: Ну, як?

Аляксей: Усё выйшла на верх. Злавілі зладзеяў.

IV дрывасек: Ды як? Хто злавіў?

Аляксей: Праз вартаўніка. Адзін вартаўнік бачыў, як яны дабіраліся. Але яны яму загразілі: цяпер толькі выказаў.

IV дрывасек: Вось бачыш! А ты так журыўся. Я-ж табе казаў, што няма чаго грызьціся. Яшчэ добра, што даўжэй не цягнулася, а то высах-бы на трэску. Але ідзі

vielmi pamocnaj pry arhanizavańni švedzkaj kooperacyi ŭ baraćbie z trustami (sajuzami promysłaŭ) i ŭ zdabyvańni kredytu. Siahońnia Liha heta maje 250 hurtkoŭ z 8 00 siabroŭkami. — Acenivajučy pracu Lihi dla kooperacyi. Švedzki Sajuz Kooperatyvaŭ „Kooperativa Forbundet" vydaŭ pamiatnuju knihu i achviaravaŭ sumu 10.000 šv. kron na stypendyjalny fond dla žančyn, što jeduć zahranicu pryhladacca čužoj kooperacyi.

— Udar pa savieckaj spažyvieckaj kooperacyi sprycyniŭ uradavy dekret z d. 4.XII.32 h., pavodle jakoha h. zv. ŭnutranyja kooperatyvy 262 vialikich pramysłovych pradpryjemstvaŭ na abšary Savietaŭ traciać svajo dahetulašniaje pradznačeńnie aprovijantavać rabotnikaŭ i pierachodziać pad ścisłuju kantrolu dyrektaroŭ samych pradpryjemstvaŭ. Usia majemaść kooperatyvaŭ, a ŭłaściva — rabotnikaŭ pierachodzić da dyrekcyjaŭ jak daŭhaletniaja pazyčka. Na hetyja ž dyrekcyi pierachodziać ciapier i vykłučnaje prava vydavańnia rabotnikam i ichnym siemjam knižak na pradukty i na pamieškańnie. —

Jak pryčynu takoha kroku ŭradavyja savieckija kruhi pakazvajuć na ŭzrost raskładu rabotnickaj dyscypliny. Niezaležnyja ad savietaŭ koły — „Konsgnsft. Rundschau" — bačać u hetym adnak zvyčajnuju formu dziaržaŭnaha pryhonu: rabotniki ciapier susiom paduładny fabryčnaj dyrekcyi za najmienšy „pochib" mohuć być zvolnieny z fabryki i razam z tym aŭtomatyčna traciać prava na charčavańnie i kvateru.

Сельская гаспадарка.

Водгукі „казённых порцыяў".

Казённымі порцыямі кармленьня свойскай жывёлы, устаноўленымі цыркулярам Віленскай Скарбовай Палаты, аб чым мы пісалі ў навагоднім нумары «Самапомачы», зацікавіліся людзі навукі і практыкі. Вынік гэтага зацікаўленьня варты ўвагі шырэйшых кругоў і дзеля таго падаём яго тут у скарочаньні.

Агулам бяручы сьцьверджана, што калі-б у кармленьні свойскай жывёлы застасаваць устаноўленыя казённыя кармовыя нормы, дык рабочыя коні не пацягнулі-б ног, каровы перасталі-б даваць малако, а сьвіні за пару месяцаў усе павыздыхалі б.

Конкрэтна, на падставе досьледаў Кельнэра і Н. Гансона, сьцьверджана, што:

1. для коняў рабочых дробных, сялянскіх, пры хляўным кармленьні праз 250 дзён у год, трэба 500 кілё*) збожжа і 2.000 кілё сена, а для коняў большых — 1.000 кілё збожжа і 3.000 кілё сена: у казённых порцыях прызнана для гэткага каня толькі 300 кілё збожжа і 2.000 кілё сена;

2. для жарабят да двух гадоў на год трэба 750 кілё збожжа і 1.250 кілё сена, замест казённых 500 кілё збожжа і 1.000 кілё сена;

3. для кароў, пры 7-мімесячным кармленьні ў хляве і самавыстарчальнасьці пашы на пасьбішчы ў летнія месяцы, для штук

*) у пудзе каля 16 кілё.

есьці, бо да работы трэба брацца... (*Аляксей есьць адзін. Дрывасекі бяруць сякеры, ды ачэсываюць калоды*).

IV дрывасек: А ну, хлопцы! Вось гэтыя дзьве абчэшым ды на казлы з імі. Трэба хоць сяньняшнюю кашу адрабіць!

I дрывасек: Ага, адробім, калі ў суботу жыд грошы ня зьменша!

IV дрывасек: Ды мы сяньня йшчэ не са дзьве парэжам. Ідзеце, Дзяніс з Аляксеем, ды абгладзьце гэну калоду, над воўчаю ямаю. А як скончыце, дык паклічце — паможам да казлоў прынесьці.

I дрывасек: Мы самі, дзядзька, прынясём. Яна не цяжкая. (*Аляксей і I дрывасек вышлі*)

II дрывасек: А каб ужо як найхутчэй тая нядзеля прыйшла! Рукі млеюць, сякеры ня могуць утрымаць...

IV дрывасек: Э, бач! Захацеў ляжачага хлеба! Я ўжо тут працую больш як дваццаць гадоў, а супачынку не чакаю. (*Сякуць. Праз хвіліну чуваць крык. I дрывасек з тэй стараны, куды пайшоў з Аляксеем*): Ай-ой-ей! Хадзеце сюды! Аляксея калода прыціснула! (*Дрывасекі бягуць у тую старану*)

IV дрывасек: Вось табе! Чаму-ж я сам ня йшоў?... (*Пабег*). (*За сцэнай быццам здалёку чуваць людзкі гоман. Праз некалькі хвілін уносяць бледнага Аляксея. Аляксей стогне*).

IV дрывасек (*да другіх*): Ану, хлопцы, давайце сьвіткі падсьцяліць! (*Дрывасекі сьцяляць сьвіткі і кладуць Аляксея.*) Нашто-ж вы бралі гэту калоду? Вось няшчасьце! Магла на сьмерць прыдушыць!

I дрывасек: Ды мы яе ня бралі! Яна ляжала адным канцом над ямай, дык мы думалі яе перакруціць. Аляксей палез у яму, я крануў, а яна перакруцілася, ды на Аляксея. Я думаў, што ўжо па ім, але пакуль вы надбеглі, дык ён адчыніў вочы.

IV дрывасек: І што мы яму ў лесе парадзім? Да вёскі так далёка! Бяжы каторы да сяла, дайце знаць войту, няхай зараз прышле фурманку. (*Кленча каля Аляксея*): Дзяржыся, хлопча. Ты малады — ачуняеш.

Аляксей (*стогне*): Ой, ой! Настачка мая! Мама! Ужо не пабачыць мне вас!

Заслона.

(д. б.)

меншых, у 300—400 кілё жывой вагі, трэба прынамся: 250 кілё збожжа, 1.300 кілё сена і 700 кілё бульбы, для кароў-жа большых, у 400—500 кілё жывой вагі, трэба ўжо 300 кілё збожжа, 1.700 кілё сена і 1.000 кілё бульбы, замест устаноўленых казной: 200 кілё збожжа і 1.000 кілё сена.

4. для цялят да 2-х гадоў, на год трэба прынамся: 500 кілё збожжа, 700 кілё сена і 900 кілё бульбы ці роўнаважнік іншых акопнінаў, замест казённых: 100 кілё збожжа, 300 кілё сена і 400 кілё бульбы;

5. запатрэбаваньне для сьвіней на год выносіць: для кнуроў краёвых 400 кілё збожжа і 1.000 кілё бульбы, для сьвіней краёвых, з парасятамі раз у год — 350 кілё збожжа і 1.000 кілё бульбы, для маладняка да 1-го году — 400—600 кілё збожжа і 500 кілё бульбы, — усё гэта пры 7-мімесячным кармленьні ў хляве, а рэшта — на полі. Для кормнэй-жа штукі, за чатыры месяцы звычайнага корму, трэба 300 кілё збожжа і 1.000 кілё бульбы, што ў пераводзе на гадавы срок (тры зьмены, па 4 месяцы кожная) патрабуе 900 кілё збожжа і 3.000 кілё бульбы. Тымчасам казённая порцыя прызнае на год сьвіням надворным толькі 100 кілё збожжа і 500 кілё бульбы, а кормным — 300 кілё збожжа і 1 000 кілё бульбы. Паводле падрахункаў гэткая казённая порцыя для надворных сьвіней не хапае нават у палавіне для захаваньня жыцьця сьвіні — не гаворачы ўжо сусём аб прыросьце — а казённая порцыя для кормных сьвіней ледзьледзь хапае для захаваньня пры жыцьці чатырохпудовага падсьвінака.

Гэтак выглядае ў сьвятле навуковапацьверджаных лічбаў казённая „апека“ і „абарона“ ад ліцытацыяў земляробскіх гаспадарак. Хто мае розум, хай справу пасудзіць сам.

С. Яновіч.

Кажух ня вата... і інш.

Хоць ужо і блізка вясна, тож аб кажусе не зашкодзіць прыпомніць хоць-бы дзеля таго, каб мець яго на наступны год. Бо без кажуха, і то — кажуха добрага, у нашым беларускім клімаце абыйсьціся ня можна. Увесь поступ веды нязьбітна даказаў, што няможна бэнзынам (аўтомобілем) замяніць аўса (каня); не заменіць і вата, ці нават з бяды захваляны кролік,—авечкі, з каторай чалавек мае і кажух, і сьвітку, і рукавіцы, і мяса...

Зразумее гэта сяньня ўжо кожны. Толькі няправільна ведзеныя гаспадарчыя мяркаваньні, рахункі (гэтак званая калькуляцыя) пужаюць яшчэ не аднаго прад наваротам да завядзеньня гадоўлі авечак. Станецца гэта незадоўга і не ў аднаго з чыста спэкулянскіх мяркаваньняў, бо гадоўля авечак, перадусім дзеля іхных аўчынак і воўны, цяпер падтрымліваецца і ўрадавымі кругамі: падрадчыкі, што дастаўляюць суконныя матэрыялы для войска і наагул для казны, мусяць перад уладамі выказацца, што для прыгатоўленьня гэтых матэрыялаў было выкарыстана найменш 40 проц. воўны краёвай, незаграмічнай. А знача збыт на воўну ёсьць і гэта сяньня найважнейшае!

—Другой справай, якая мае многа шансаў на хуткае разьвіцьцё і аплатнасьць, ёсьць лён. Вядзецца цяпер даволі жывая праца ў тым кірунку, каб спопулярызаваць усюды вырабы з лёну, замест дагэтуляшняй баваўны ці чаго там яшчэ іншага прывознага. І гэта таксама мае добрыя відокі розьвітку. Трэба толькі пераламаць няшчасную моду, што палатно льнянае гэта нешта горшае... Ёсьць тут дзьве справы, а ўласьціва тры, ад якіх залежыць дальшы лёс ўсяго льнярства перадусім на нашых беларускіх землях:

1. трэба навучыцца выробляць д о б р ы я с а р т ы самадзелаў;

2. трэба навучыцца з гэтых тканінаў адпаведную адзежу ш ы ц ь і

3. вёска мусіць сама перадусім ўжываць льняныя тканіны, а не даваць выпярэджваць сябе ў гэтым жыхарству гарадзкому, як гэта—на жаль — дагэтуль мае мейсца.

Усё гэта верне нам нашу душу, наш воблік і ўсьцеражэ нас ад жабрачага кія: бо-ж грошы выданыя на дурную тандэту у вёску нашу ніколі ўжо не варочаюцца і дзеля таго так цяжка на вёсцы на грош.

о—о

Лекарскія павагі нязьбітна цьвердзяць, што наш чалавек станоўча за мала есьць садовіны і усякага варыва; а яны чалавеку часта больш патрэбны як мяса і нават вырабы малочныя.

—о—

Прыймаючы ўсё гэта пад увагу клічам нашых беларускіх гаспадароў ужо цяпер мяркаваць, каб з наступленьнем вясны 1. прыдбаць сабе адну — другую авечку, 2. засеяць загончых — другі лёну і 3. засадзіць пару градкаў гародніны. — Усё гэта вельмі магчыма да зьдзейсьненьня і гэтак патрэбна!

Г. А.

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ.

Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 6—10.

Выдавецкі рух.

інж. Е. Храпливий: **Про хліборобський вишкіл сільської молоді** — Бібліятэка "Сільського Господаря" № 93. Львоў 1932 г., бачынаў 72.

Чым цяжэй націскае крызыс, тымбольш адчуваецца патрэба фаховага прыгатаваньня. Гэтак у кожнай галіне працы, гэтак і ў земляробстве. Мы, беларусы, у гэтай працы вельмі адсталі, а тое што ў нас робіцца пад фірмай „конкурсаў" — далёка ад мэты, бо варункі іхнага праводжаньня сусём інакшыя ад варункаў працы ў гаспадарцы: пры „конкурсах" даецца і насеньне, і пагноі, а хто-ж усё гэта дасьць дарма гаспадару?...

Украінская праца ў гэтым кірунку ідзе іншым шляхам, шляхам самавыстарчальнасьці ня толькі ў жыцьці практычным, але і пры навучаньні. Пладавіты ж і рухлівы ў кожным кірунку працаўнік украінскі інж. Аўгень Храпливий напісаў вельмі цэнны падручнік аб тым, як арганізаваць такія самастужныя самаасьветныя гурткі і як у іх весьці працу. Кніжка гэта п. н. „Про хліборобський вишкіл сільськоі молоді" напісана вельмі ясна і можа служыць за помач ня толькі украінцу, але і беларусу; натуральна, прыняўшы пад увагу ўсе адменнасьці характару нацыянальна-тэрыторыяльнага. Дастаць кніжку можна у Т-ве „Сільський Господар", Львоў, вул. Зімаровіча 20.

Альбом „Масласаюзу" 1907—1932 г. Мы ўжо пісалі ў № 3 „Самапомачы" леташняга году аб 25-тых угодках заснаваньня і працы украінскай малачарскай коопэрацыі, згуртаванай сяньня ў „Масласаюзе." Вось-жа дырэкцыя гэтага „М—зу," каб трывала ўшанаваць гэтыя ўгодкі і пашырыць прапаганду украінскага коопэратыўнага малачарства, выдала юбілейны альбом з тэкстам ў пяцёх мовах: украінскай, францускай, англійскай, нямецкай, і польскай. Альбом выданы вельмі старанна, мае густоўную вокладку украінскага маляра-артыста Ковжуна і абымае больш сотні розных фотографічных здымкаў з жыцьця і працы украінскай малачарскай коопэрацыі ад самых пачаткаў і да нашых дзён.

Прыймаючы пад увагу люксусовае выданьне Альбому, цана ягоная—2.50зл.—за экзэмпляр менш як танная.—Выпісаць альбом можна з „Масласаюзу" у Львове, вул. Б. Гловацкага 23.

7.

Гаспадарчая хроніка.

— Погаласкі ходзяць, што мае быць абніжана такса за перавоз чыгункай яек. З іншага ўзноў боку наказваюць, што мае патанець і газа (карасіна). Ці гэтыя погаласкі спраўдзяцца — іншая рэч; а як бы некалі і спраўдзіліся, дык: 1. бадай ня будзе ўжо чаго перавозіць і 2. дні падаўжэюць на гэтулькі, што газа чалавеку будзе ўжо непатрэбная.

— **Ліквідацыя** (касаваньне) прадпрыемстваў гандлёвых і прамысловых ёсьць вынікам бязупыннага росту крызысовай хвалі. Гэтак у Вільні за два апошнія месяцы, сьнежань і студзень, было зьліквідавана: 18 рэстаранаў, 10 фрызіерыяў, 3 крамы з рукавічкамі, 11 крамаў галянтэрыйных, 6 майстэрняў кравецкіх, 5 крамаў з канцэлярыйным прыладзьдзем, 24 крамы мясныя, 42 крамы спажывецкія, 19 майстэрняў шавецкіх, 14 майстэрняў сталярскіх, 3 пякарні, 3 крамы з абуткам, узяты з руху 4 аўтотаксоўкі і апрача таго пакасавана 44 іншыя прадпрыемствы. Разам зьліквідавана за два месяцы у аднэй толькі Вільні 206 гаспадарчых пляцовак.

— **З Віленскай збажжова-таварнай і льнярскай бурсы.** На паседжаньні Рады бурсы дня 8 г. м. пастаноўлена абзнаёміцца з магчымасьцю завядзеньня на бурсе трансакцыяў на мяса. — На гэтым-жа паседжаньні пастаноўлена утварыць тры сэкцыі бронжаў: збажжова-мучной, льнярскай і насеннай. Сэкцыі гэтыя маюць апрацаваць рэгуляміны браньня пробаў.

ЦЭНЫ Ў ВІЛЬНІ

паводле нотаваньняў Віленскай збажжова-таварнай і льнярскай бурсы з 13 да 20.II.33 г. за 100 кілё; тавар сярэдняй якасьці

Жыта мяшанае — ад 19.00 да 20.50 зл.; пшаніца прывозная, мяшаная ад 29.50 да 31.00 зл.; ячмень на пансак — 15.50 зл.; авёс ад 12.75 да 13.00 зл; мука жытняя 55 прац. ад 30.00 да 37.00 зл.; мука жытняя 65 прац. ад 26.00 да 28.00 зл.; мука разовая ад 21.0 да 23.00 зл.; мука пшонная 4° ад 49.37 да 53.00; крупы грэчныя — 38.00; пансак ячменны — 27.00—34.00 зл.; крупы аўсяныя — 54.00 зл.

Цэны на хлеб Віленскім гарадзкім старастай устаноўлены 18 г. м. на хлеб гэткія цэны: пітлёвы жытні белы за кілё — 35 гр., падсітковы жытні — 28 гр. разовы жытні — 24 гр. — Тэндэнцыя усьцяж звыжковая.

Макухі (на Курляндзкай алеярні): за 100 кілё льняных — 19.50 зл. сланэчнікавых 15.00 Зл.

Малочнае (паводле нотаваньняў Віленскага малачарскага саюзу з 20.II.33 г.: масла найлепшае за 1 кілё ў гурце — 2.90—3.10 зл., у дэталю — 3.20—3.40 зл.; масла сталовае у гурце — 2.70—2.90 зл.; у дэталю — 3.20 зл.; масла салёнае ў гурце—2.60 зл., у дэталю — 2.90—3.00 зл.; сыры з тварагу за кілё у гурце 1.10 зл., у дэталю — 1.30 зл.; сыры літоўскія за кілё ў гурце 2.00—2.60 зл., у дэталю — 2.20—2.80 зл.; яйкі за капу 6.00—8.40 зл., за штуку 11—16 грашоў; мёд за кілё у гурце 1.80—2.20 зл., у дэталю 2.00—2.40 зл.

Мяса (на Віленскай гарадзкой бойні) за кілё гавяды (валовіна) 0.80—0.95 зл.; сьвініна—1.10 — 1.25 цяляціна — 0.55—0.60 зл. Цана за кілё бітай вагі.

За апошні тыдзень (13—20.II) цэны на быдла і на сьвіней на віленскім рынку значна падняліся, прыблізна на 35 проц.: плацілі 35—37 грашоў за кілё жывой вагі скаціны і 1 зл. за кілё жывой вагі сьвіней. — Як на прычыну гэтага явішча паказваюць на вывоз быдла і сьвіней з мясцовага рынку, а таксама на погаласкі аб магчымасьці гандлёвых зносінаў з Саветамі.

Падняліся, хоць менш, цэны на мучное і на малочнае.

Воўна (у Беластоку дн. 19.II.1933 г.) краёвая, напалоўу мытая, за кілё гуртам 2.75—2.85 зл.

Лён (экспортны гуртам за 1.000 кілё на граніцах: польска-латвіскай, польска-нямецкай, або латыскай: Сырэц Гадуціскі — 787 зл.; трапаны Валожынскі — 1.215 зл.; мочаны Друйскі — 1.237 зл., часаны рукамі — 1953 зл., машынай — 2474 зл.; кудзеля Гародзейская — 1150.; кудзеля Горадзенская — 998 зл.

— **Льняная семя** лёгка пайшло ў цане ўгару і цэніцца цяпер каля 34 зл. за 100 кілё.

— **Грошы.** Дн. 9.II.33 г. за доляр плацілі — 8.91—8.80 зл.; за рубель золатам — 4.78—4.70 зл.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ.